# ДА КРЫНІЦЫ ЖЫВОГА СЛОВА

*Лексічны атлас беларускіх народных гаворак :*
*аналітычныя і даведачна-інфармацыйныя матэрыялы /*
*Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ.,*
*Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа ; уклад., манаграф. раздзел і інш.*
*В. М. Курцова. – Мн. : Беларус. навука, 2024. – 573 с.*

Манаграфія Веранікі Мікалаеўны Курцовай з’яўляецца сур’ёзным і запатрабаваным даследаваннем, у якім асэнсоўваецца патэнцыял знакавага твора беларускай лінгвістыкі – «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак». Выданне атласа як адметнай крыніцы звестак пра слоўнікавы склад беларускіх народных гаворак абумоўлена папярэдняй гісторыяй вывучэння нацыянальнага лінгвістычнага ландшафту, неабходнасцю ў комплексным апісанні дыялектнай разнавіднасці нацыянальнай мовы, яе шматмернай панарамнай фіксацыі, задачай паўней і хутчэй зрабіць навуковым здабыткам народную традыцыйную лексіку. Кніга В. М. Курцовай робіць актуальнай праблематыку лінгвагеаграфічных даследаванняў і скіроўвае на далейшыя навуковыя пошукі заканамернасцей прасторавай дыстрыбуцыі моўных з’яў.

Манаграфія складаецца з шасці раздзелаў: бібліяграфічнай часткі, у межах якой асобныя параграфы прысвечаны рэпрэзентацыі навуковай дзейнасці супрацоўнікаў аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Ю. Ф. Мацкевіч, А. І. Чабярук, Я. М. Рамановіч, С. Г. Лобач, Ф. Д. Клімчука і І. Я. Яшкіна – найбольш актыўнай групы ўдзельнікаў унікальнага праекта, узнагароджаных Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь; манаграфічнага раздзела пра лексічны атлас, дзе расказваецца пра гісторыю яго ўзнікнення, структуру, тыпы лінгвагеаграфічных карт і іх спецыфіку; з індэкса слоў, зафіксаваных у пяці тамах атласа; даведачных матэрыялаў, а таксама дадаткаў з інфармацыяй аб правядзенні дыялекталагічных экспедыцый і інш.; з «Інструкцыі па збіранні матэрыялаў для складання лексічнага атласа беларускай мовы».

Праца падаецца аўтарам як спроба сістэматызацыі матэрыялаў атласа, што варта лічыць вопытам асэнсавання зместу некаторых лінгвакарт не столькі дзеля рэалізацыі ізаглоснага падзелу беларускай дыялектнай прасторы, а для характарыстыкі іх як найбагацейшай намінацыйнай крыніцы па пашырэнні складу абазначальных сродкаў беларускай літаратурнай мовы.

Аўтарам праведзена сістэматызацыя ўсіх наяўных звестак, звязаных з рэалізаваным праектам.

У каментарыях, уключаных у рэцэнзуемае выданне, пры неабходнасці ўносіліся змены: выпраўлены недакладнасці; прастаўлены націск у прыкладах і тэкставых ілюстрацыях, калі ён адсутнічаў, і інш. У выданні аб’яднана вялікая колькасць выверaных даных, рэпрэзентацыя якіх характарызуецца высокай ступенню навуковай дакладнасці.

Праца «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: аналітычныя і даведачна-інфармацыйныя матэрыялы», выкананая аўтарытэтным вучоным, кваліфікуецца як сапраўдны ўзор навуковай ініцыятывы – захаваны галоўны ідэйны сэнс першакрыніцы, які шматгранна раскрываецца і значна ўзбагачаецца менавіта ў кантэксце дапаўнення інфармацыйна-даведачным блокам даных.

Матэрыялы значныя для ўсведамлення гістарычнага развіцця беларускай мовы, для развіцця беларускага мовазнаўства. Безумоўна, як тэарэтычны, так і практычны змест рэцэнзуемага выдання будзе карысным для дыялектолагаў, лінгвагеографаў, славістаў, а таксама для ўсіх, хто цікавіцца беларускай культурай і нацыянальнай спадчынай, увасобленай у слове.

**_Лена Васільеўна Леванцэвіч,_**
*кандыдат філалалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*